УДК 811.161.3'42'371:32.019.5 (=161.3)

**А. М. Ермакова** (Гомель)

# КАНЦЭПТУАЛІЗАЦЫЯ ЧАЛАВЕЧАГА ЛЁСУ Ў МОЎНАЙ СВЯДОМАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

Лексічная адзінка апошнім часам у даследчых мэтах усё часцей разглядаецца як канцэпт. Адзінка, якой чалавек аперыруе ў працэсе кагніцыі і канцэптуалізацыі ведаў пра свет. Агульнанацыянальныя канцэпты ўтвараюць моўную карціну свету пэўнай лінгвакультурнай супольнасці, што фіксуецца ў межах семантычнай сістэмы мовы. Канцэпты нараджаюцца ў свядомасці індывіда як вобразы, якія вербалізуюцца больш ці менш дакладна. А гэта значыць, што яны могуць быць даследаваны лінгвістычнымі метадамі.

Мадэляванне моўнай карціны свету магчыма пасродкам аналізу канцэптаў, што ўваходзяць у яе. Карціна свету – цэнтральнае паняцце канцэпцыі чалавека, якое як ідэальнае ўтварэнне выражаецца знакавымі формамі, напрыклад такой, як натуральная мова. Менавіта мова дае магчымасць рэканструкцыі свядомасці, бо гэта – “прастора сэнсаў, у якой жыве чалавек” [1, с. 44]. Даць характарыстыку найбольш значных, базісных уяўленняў чалавека аб свеце можна праз аналіз культурна значных канцэптаў. Такія ўніверсальныя паняцці, як *лёс*, складаюць ядро нацыянальнай і індывідуальнай свядомасці.

Змест канцэпту становіцца даступным у выніку аналізу семантыкі слоў, фразеалагізмаў, сказаў, тэкстаў.

Паэтычны свет, па меркаванні Ю. М. Лотмана, з аднаго боку, уяўляе сабой мадэль рэальнага свету, з дрогога боку, складаным чынам суадносіцца з ім. Паэтычны тэкст – гэта дыялектычны механізм пошуку ісціны, тлумачэння акаляючага свету і арыенціроўкі ў ім. "Мэта паэзіі не ў пошуку асаблівых прыёмаў, а ў пазнанні свету і зносінах паміж людзьмі, самапазнанні, самапабудове чалавечай асобы ў працэсе самапазнання і камунікацыі. У канчатковым выніку мэта паэзіі супадае з мэтай культуры ў цэлым" [2, с. 131].

Крыніцай нашага даследавання паслужаць паэтычныя тэксты выдатнага беларускага паэта Рыгора Барадуліна.

Канцэпт вербалізуецца моўнымі адзінкамі. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы зафіксаваў наступныя значэнні слова *лёс* [3, с. 41] .

Лёс, -у, м. р.

1. Ход падзей, якія складваюцца незалежна ад волі чалавека; збег акалічнасцей.

*Я жыў, **як мне дазволіў Бог**, /* [4, с. 141].

*Шаноўны спадару Лёсе, / Нікому ў жыцці яшчэ / Цябе абыйсці не ўдалося, / Пакуль несупыннасць цячэ* [4, с. 257].

*Падвешвае лёс калыску бяссонную / Кожнаму / За цёплую зорку ягоную* [5, с. 161].

2. Доля. Людскі лёс. Жаночы лёс.

*І зморшчынкамі на тваім ілбе / Праклала сцежкі **доля незямная**. / Яна падказвае **тваёй зямной** / **Азяблай долі**, / Як пялегваць мрою. / Душа жыве забытаю маною, / Дрыжыць над кожнай звычкаю старой* [4, с. 148].

*І як з жыццем ні хітрыш, – / Яно табе ставіць крыж* [5, с. 162].

3. Развіццё чаго-н.; далейшае існаванне, будучыня. Гістарычны лёс нацыі. Лёс чалавецтва.

Індывідуальны лёс неаддзельны ад лёсу этнасу. Броўнаўскі рух нашых індывідуальных лёсаў складаецца ў агульны нацыянальны і адзіны ў выніку:

*Мы нясем свой крыж наканаваны* (адзін на ўсіх), */ Хто плячо падменіць* (ніхто акрамя нас не вырашаыць нашыя праблемы), *Не чакаем. / Як ні душаць нас, мы не знікаем. / ... / Трэба – / Самі зробімся крыжамі, /... / У нябёсах душаў і ў паглядах / Беларусь – / Наш крыж наканаваны...* [4, с. 149].

*Крыж – спынены вятрак / І ўсмешка руху, / ... / Крыж – скачанелы птах / І ўзмах сумневу, / ... / **Крыж – гэта мы**, / Што ўсё ўхапіць хацелі / І нецярпліва рукі развялі. / Але здранцвелі й ценямі ў быллі, / Дрыжэцьмем / Над сваёй глухой пасцеллю* [4, с. 182].

Стварэнне асабістага жыцця – адзін з найбольш складаных відаў чалавечай творчасці, а жыццёвыя шляхі аказваюцца такімі заблытанымі і звілістымі. *Пасад і званяў абляціць лісцё,/ І застанецца голы ствол слупка / Магільнага. / І змесціцца жыццё / У сукупнасці апошняга радка. / Пра што ён скажа / Чытачу жывому, / Што цягне ўсё яшчэ / Зямную стому?..* [6, с. 120].

Да якой ступені чалавек самастойны ў выбары шляху, дзе межы яго свабоды і волі, ці ёсць тое, што не залежыць ад яго, якія сілы вызначаюць накірунак шляху? І што такое лёс?

*На балі жыцця надзея чужая / Лёс на белы вальс запрашае* [5, с. 162].

Уяўленні аб чалавечым лёсе разнастайныя і часам супярэчлівыя. Як быццам спрэчка эпікурэйцаў і стоікаў цягнецца і па сённяшні дзень. Ідэя свабоды чалавека як магчымасці самастойнага выбару лёсу супрацьпастаўлена ўяўленню аб немагчымасці супрацьстаяць яму.

Лёс не толькі фатум, але і развіццё, далейшае існаванне, будучыня.

Чалавек павінен вытрымліваць удары лёсу, не быць слабым, не даць яму магчымасць сябе "аплакаць": *Дзеці застаюцца, / Каб бацькам / Болю і бяды не стала меней. / Іржавець старым, / Як тым цвікам, / Што жыццё трымае / Мокрай жменяй* (лёс вольны рабіць усё з чалавекам). / ... / *Застаюцца дзеці ды сябры, / Покуль застаемся мы сабою* (застаемся дюдзьмі, любім і сябруем, здольныя адчуваць боль). / *Доля ўсё ўглядаецца савою, / Дзе аплакаць / Дрэва без кары...*( не аплача, покуль мы застаемся сабою, трымаем сваю "кару", абаронены болем за самых блізкіх, нясем за іх адказнасць) [4, с. 17].

Чалавек павінен прыняць будучыню, не ўмешвацца ў ход падзей.

*Вучыць не трэба маладых, / Ні лашчыць,/ Ні даваць пад дых,/ Ім думаць / Трэба даць магчымасць. / Дзяліць не трэба маладых / На гнедых, / Шэрых, / На рудых, – / Абы яны былі з вачыма. / Дзе дзёрзкасць і непрымірэнне, / Нібыта ў першы дзень тварэння...* [6, с. 126].

Змены ў лепшы бок магчымыя ў жыцці пазітыўнага чалавека, які валодае смеласцю і рашучасцю, здольны перайсці ад пасіўнага да актыўнага фарміравання жыццёвага шляху: *Не забудзься, што кожны / Твой **крок** на прыкмеце. / **Множ дабро колькі моцы**, / Не лічачы множ. / Прышануй цішыню / Ў гэтым стомленым свеце, / **Каб пачуць**, як ступае / Гасподзь басанож* [4, с. 135]. Чалавек зусім не вольны ў выбары свайго жыццёвага шляху і рэалізацыі асабістага лёсу. І любая актыўнасць можа прывесці да непапраўнага, бо можна пагоршыць свой лёс. Аднак і пасіўнасць асуджаецца: *Апосталам балюча на зямлі, / Балюча й за бязмозглых, і за мудрых. / Як **зняць з плячэй з бядою хатулі**?* (працівіцца, супрацьстаяць бядзе) / *Хто **лёс праспаў** свой , / Як спытаць, **чаму дрых**?* [4, с. 147].

Чалавек можа зразумець, усвядоміць свой лёс і дабіцца самарэалізацыі. Падобная жыццёвая пазіцыя патрабуе вельмі высокай ступені адказнасці, гатоўнасці прыняць усё, праз што давядзецца прайсці на шляху да мэты: *Ці зважае на брэх прарок, / Што **прыйшоў ратаваць** ад аблуды, / ... / Ці зважае на смех прарок, / Што **прыйшоў разбудзіць** сумленне, /.../ Ці зважае на гнеў прарок, / Што **прыйшоў разняволіць** волю* (Той, хто прыйшоў ратаваць, разбудзіць, разняволіць, будзе асмеяны, выслухае брэх і вытрымае гнеў. Аднак яго намаганні не марныя) / *За прарокам / Наколькі сілы / **След у след ідуць небасхілы*** (небасхілы не паспяваюць за такім чалавекам!) [4, с. 146].

"Лёс ставіцца да чалавека такім самым чынам, як зямля, ля якой яго трымае сіла цяжару, але без якой чалавек не здолеў бы хадзіць. Мы павінны прыняць свой лёс, як зямлю, на якой мы стаім, – зямлю, якая служыць нам трамплінам для нашай свабоды. Свабода без лёсу немагчымая; свабода можа значыць толькі свабоду ў адносінах да асабістага лёсу" [6, с. 22].

ЛІТАРАТУРА

1. *Вендина, Т. И.* Средневековый человек в зеркале старославянского языка / Т. И. Вендина. – М. : Индрик, 2002. – 336 с.

2. *Лотман, Ю. М.* Анализ поэтического текста: Структура стиха // Ю. М. Лотман. О поэтах и поэзии / Ю. М. Лотман. – СПб, 1996. – С. 18–252.

3. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. – Мінск. : Галоўная рэд. Беларус. Сав. Энцыкл., 1979. – Т. 3: Л – П. – 672 с.

4. *Барадулін, Р.* Калі рукаюцца душы… / Р. Барадулін, В. Быкаў. – Мінск, 2003. – 344 с.

5. *Барадулін, Р.* Босая зорка / Р. Барадулін. – Мінск : ГА Беларус. таварыства "Кніга", 2000. – 177 с.

6. *Барадулін, Р.* Выбраныя творы : у 2 т. / Р. Барадулін. – Мінск : Мастац. літ., 1984. – Т. 2: Вершы, паэмы, радкі дарог. – 335 с.